Святочны настрой адчуваўся ў кожным кутку

951-ы дзень нараджэння сталіцы адзначылі фестывалем актыўнага ладу жыцця

На працягу двух дзён праспект Пераможцаў прымаў сапраўдны спартыўны марафон. Субота адкрыла для гараджан і гасцей сталіцы адразу сем спартыўных пляцовак у цэнтры Мінска.

Адной з самых масавых стаў непасрэдна сам праспект, на якім адбыўся Міжнародны марафон на роліках Roller Starts. Выпадак беспрэцэдэнтны — любы ахвотны мог паспрабаваць сябе ў гонцы з прафесійнымі спартсменамі, бо сярод трох сотняў удзельнікаў марафону — уся наша беларуская зборная, якая паўгода таму выступала ў алімпійскім Пхёнчхане. На дыстанцыю ў 16 кругоў, па 2 км кожны, выходзілі і дарослыя, і дзеці, для многіх галоўным быў удзел, аднак і аб спартыўным саперніцтве ўдзельнікі не забывалі. Пераможцамі ж ролер-марафону сталі беларуска Марына Зуева і француз Валянцін Цібо, астатнія атрымалі гарантаваны зарад бадзёрасці і добрага настрою.

У гэты час на пляцоўцы каля Палаца спорту вызначаўся самы моцны спартсмен міжнароднага турніру па сілавым экстрыме, сярод стронгменаў з шасці краін найлепшым стаў беларус Аляксандр Курак.

Крыху далей у акваторыі ракі Свіслач разгарнуліся спаборніцтвы сярод весляроў «Зорная рэгата». Зусім нядаўна беларускія спартсмены прывезлі ўзнагароды з чэмпіянату свету, а ўжо ў суботу яны паказвалі сваё майстэрства ў цэнтры Мінска. Тут чэмпіёны Арцём Козыр і Алена Наздрова, побач у лодках журналісты, валанцёры і беларускія селебрэці. Гэта найлепшае пацвярджэнне — вялікае свята аб'ядноўвае людзей розных прафесій.

У непасрэднай блізкасці каля Палаца спорту турнір больш сур'ёзны. На «Palova-арэне» гуляюць у баскетбол 3 на 3. Акрамя разборак мясцовага маштабу — нацыянальнай лігі, — святкаванне дня горада супала з тэставым турнірам па баскетболе перад II Еўрапейскімі гульнямі. Дарэчы, Беларусь там была прадстаўлена адразу дзвюма зборнымі: Belarus і RB unders. Асноўная каманда лічылася адной з галоўных прэтэндэнтак на чэмпіёнства, але спынілася літаральна за крок ад мэты: яе апярэдзіла зборная Украіны.

Святочны настрой адчуваўся ў кожным кутку сталіцы, але многія актыўныя і спартыўныя беларусы ў суботу толькі прыглядаліся да спартыўных пляцовак, усё таму, што ў нядзелю Мінск чакала яшчэ адна маштабная падзея — Мінскі паўмарафон.

З кожным годам забег, які стаў вядомы ўжо ва ўсім свеце, набывае ўсё большыя маштабы, на гэты раз у ім прынялі ўдзел каля 35 тысяч чалавек. Гэта прадстаўнікі 53 краін, бегуны з 198 населеных пунктаў Беларусі і 89 гарадоў Расіі. Адзначым, што замежнікаў сёлета было 1300 чалавек. Мінск даў бегунам новую трасу. На думку многіх, яна стала куды больш складанай, удзельнікі атрымалі магчымасць апрабаваць на сабе ўсе сталічныя горкі.

Першымі на старт выйшлі спартсмены, якія ўдзельнічалі ў забегу на 21,5 км. Калі сярод мужчын відавочнымі фаварытамі былі афрыканскія бегуны, то сітуацыя ў жаночым спаборніцтве атрымалася куды цікавейшая. Разам з нашай Вольгай Мазуронак на перамогу прэтэндавалі яшчэ некалькі чалавек. У выніку залаты медаль дастаўся Шэйле Ероціч з Кеніі, якая апярэдзіла беларуску Святлану Кудзеліч усяго на секунду. Вольга Мазуронак аказалася толькі пятай.

Пераможцам сярод мужчын стаў Абеба Негева Дэгефа з Эфіопіі.

Забег на 10,5 км сабраў найбольш падрыхтаваных удзельнікаў, сярод якіх аказаўся і дэбютант мерапрыемства міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук. Ён адзначыў добрую арганізацыю паўмарафону.

Самым шматлікім заканамерна стаў забег на 5,5 км: ён не толькі сабраў асобных аматараў бегу, але і цэлыя працоўныя калектывы, каманды вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Усяго ў ім узялі ўдзел больш за 25 тысяч чалавек, а перамогу святкавалі Максім Юшчанка ў мужчын і Дар'я Барысевіч у жанчын.

Дарэчы, прызавы фонд Мінскага паўмарафону — 2018 склаў 50 000 долараў, ну а ўсе ўдзельнікі па традыцыі атрымалі эксклюзіўныя медалі.

Старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Вадзім Дзевятоўскі выказаў надзею, што яго арганізацыя справілася з усімі задачамі і патрабаваннямі для таго, каб атрымаць Сярэбраны лэйбл статусных забегаў Міжнароднай асацыяцыі лёгкаатлетычных федэрацый. У хуткім часе ацэначная камісія, якая прысутнічала на мерапрыемстве, вынесе свой вердыкт па гэтым пытанні.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Непераможная бронь дзяржавы

Сталіца адзначыла Дзень танкіста

У другой палове дня ў нядзелю парк Перамогі ў Мінску ператварыўся ў адну вялікую забаўляльную пляцоўку. Сюды ішлі тысячы людзей, каб дакрануцца да арміі ў літаральным сэнсе гэтага слова. Яны святкавалі Дзень танкіста. Арганізатарамі свята выступілі Мінскі гарвыканкам, Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь і кампанія Wargaming.

Першае практыкаванне прапаноўвалі прайсці ваеннаслужачыя Ваеннай акадэміі. Яно было немудрагелістае — паспрабаваць падняць над галавой снарад і стаць найлепшым у максімальным падыманні клін-затвора танка Т-72Б. Снарад, дарэчы, аказаўся не такі і цяжкі — усяго 22 кілаграмы. А вось з клін-затворам выйшла неспадзяванка. Справа ў тым, што ён важыць на 50 кілаграмаў болей, а плошча паверхні яго значна меншая, каб лягчэй размеркаваць вагу. І таму з ім маглі справіцца толькі сапраўдныя асілкі.

47 разоў «выціснуць» клін-затвор здолеў Дзмітрый Карнееў. Ён атрымаў каштоўны падарунак. Сярод прызоў — вымпел і дыск з армейскімі песнямі.

— Цяжка было? — пытаюся.

— Так, і дагэтуль вібрацыя ў руках адчуваецца. Ніколі не думаў, што магу падняць столькі разоў. Ну 25, 30 без падрыхтоўкі... Раней, гадоў да 20, я займаўся сілавымі відамі спорту і працаваў дома на зямлі. Сам я родам з вёскі, з Крычаўскага раёна. Зараз працую на Мінскім камбінаце хлебапрадуктаў намеснікам галоўнага інжынера. Але рукі памятаюць!

Адметна, што «Армейскі плацдарм» стаў сапраўдным сямейным святам. Дзецям было цікава ўсё. І ім дазволілі абсалютна ўсё — залезці на Т-72Б, пасядзець унутры браніраванага аўтамабіля МЗКТ 490 100, аб чым іх таты ў свой час маглі толькі марыць...

Дзясяткі малых абступілі танк Т-72Б, экіпаж якога ўдзельнічаў у нядаўніх міжнародных армейскіх гульнях. Тыя хлопчыкі і дзяўчаткі, якім яшчэ не споўнілася 10 гадоў, пасля невялікай лекцыі павінны былі адказаць на 15 пытанняў, з чаго складаецца танк. Прызёраў конкурсу на веданне матэрыяльнай часткі ўзнагароджваў знакаміты беларускі спявак Анатоль Ярмоленка. Найлепшым стаў першакласнік Акім, які не дапусціў ніводнай памылкі. Ён прыйшоў на свята ў майцы з красамоўным надпісам — «Быць маміным абаронцам».

— Армія вучыць маладога хлопца быць мужчынам, які можа абараніць сваю сям'ю, сяброў, Радзіму. Армія бярэ на сябе не толькі патрыятычную функцыю, але і навучыць авалодаць тэхнікай, што спатрэбіцца ў жыцці.

Найвелізарнейшай папулярнасцю карысталася пляцоўка, на якой былі выстаўлены ўзбраенне і ўзоры ваеннай формы адзення падраздзяленняў сіл спецыяльных аперацый. Чаго там толькі не было: і снайперскія вінтоўкі, і спецыяльны аўтамат, і пісталет-кулямёт, і монакуляр начнога бачання, і бронекамізэлькі, і шлемы...

Крыху далей размясціліся сувязісты. Там таксама не было адбою ад дзяцей, і не ў апошнюю чаргу іх дзівіла тое, што можна размаўляць паміж сабой не толькі па мабільніку, але і па радыёстанцыях і палявых тэлефонных апаратах, карыстацца камутатарам...

Сувязісты таксама праводзілі свой конкурс — хто хутчэй збярэ апаратуру для сувязі і перадасць паведамленне. Найлепшым стаў мінскі чацвёртакласнік Павел Лісіца. Ён атрымаў у падарунак гадзіннік ад міністра абароны.

— Мне спадабалася настройваць частоты, падключаць кабелі, несці катушку з кабелем, падаваць сігнал з тэлефона на радыёстанцыю. Усё гэта так захапляльна! І пасля сённяшняга свята я вельмі хачу, калі стану дарослым, адслужыць у войску.

Свята скончылася салютам. У тым ліку — і ў гонар танкістаў, якія няспынна абараняюць Радзіму. Нагадаем, што зараз у Беларусі праходзіць буйное камандна-штабное вучэнне, у якім задзейнічана каля сямі з паловай тысяч вайскоўцаў і каля 260 адзінак бранятэхнікі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Фота паласы Ганны ЗАНКАВІЧ. Больш фота глядзіце на сайце www.zviazda.by